Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛЮТАГА 2017 г. ПЯТНІЦА № 23 (28387)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Уласны брэнд у 22 гады**

СТАР. 4



**«Дзіцячаму доктару» споўніўся год**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, першы намеснік міністра фінансаў:**

*«Што датычыцца бюджэтнай палітыкі краіны, то падыходы, закладзеныя ў бюджэт 2017 года, дастаткова кансерватыўныя і прадугледжваюць меры па бюджэтнай кансалідацыі, бюджэт сфарміраваны з прафіцытам. Як вядома, Беларусь імкнецца да таго, каб пачаць новую праграму супрацоўніцтва з Міжнародным валютным фондам у першай палове 2017 года».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9344 | ▼ |
| Еўра | 2,0875 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0322 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0715 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Хоцімскі віртуоз



Уладзіміра КОРНЕВА называюць віртуозам ігры на гармоніку. Музыкант жыве ў Хоцімскім раёне, але яго ведаюць далёка за межамі Магілёўшчыны. Маючы абсалютны слых і бездакорнае адчуванне рытму, Уладзімір Захаравіч яшчэ ў маленстве авалодаў «двухрадкай», іграў на вяселлях і провадах у армію, узнімаў настрой саслужыўцам, калі сам праходзіў воінскую службу. Цяпер гэты адораны жыхар вёскі Трасціно рамантуе старыя інструменты, таму ў яго хаце так шмат гармонікаў — тульскіх, нямецкіх, і, само сабою, беларускіх.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Актуальна

## СКАРЫНА КРОЧЫЦЬ ПА ПЛАНЕЦЕ

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню

### Першадрукар — наш пасол ва ўсім свеце



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Прадстаўляць Беларусь можна па-рознаму: праз адметныя вырабы, тавары, праз мастацтва, але найлепш пра краіну расказваюць людзі. Думаецца, асоба Францыска Скарыны — Чалавека Свету, які зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё еўрапейскай культуры, аб'яднаў сваёй працай многія гарады і краіны, — і сёння з'яўляецца найлепшым дыпламатам. Таму невыпадкова ў плане святкавання 500-годдзя беларускага кнігавыдання, якое мы шырока адзначаем сёлета, так многа міжнародных праектаў. Пра Скарыну будуць расказваць нашы суайчыннікі, праводзячы Дні беларускай культуры ў розных краінах. На яго ж звернуць увагу госці іншых дзяржаў, якія завітаюць да нас на канферэнцыі, выстаўкі, сімпозіумы.**

СТАР. 3

■ Гендар

## Жанчыны з дзецьмі — нязручныя работнікі?

Беларусы сутыкаюцца з дыскрымінацыяй на рынку працы, але ў суд не звяртаюцца

**«На чарговым сходзе кіраўнік сказаў нам, што на працоўным месцы паміраць не трэба: хварэеце — ідзіце на «бальнічны». А калі дзеці хварэюць, то вы можаце сабе дазволіць няньку. Калі пойдзеце на дзіцячы «бальнічны» тры разы за год, з вамі не працягнуць кантракт». Гэта адна з гісторый, сабраных падчас інфармацыйнай кампаніі «Пол не столь», якая вывучала пытанні няроўнасці па прыкмеце полу на рынку працы.**

### «СЫХОДЗІЎ У ДЭКРЭТ — З МЯНЕ ПАСМЯЯЛІСЯ»

Міжнародная грамадская арганізацыя «Гендарныя перспектывы» запусціла кампанію ў жніўні мінулага года. За гэты час было даслана каля паўсотні гісторый аб дыскрымінацыі. Большасць з іх (90 працэнтаў) паступіла ад жанчын. У кожнай шостай гісторыі дамы расказвалі, што яны атрымлівалі адмову ў прыёме на работу, бо на гэту пасаду наймальнік планаваў узяць мужчыну, які з'яўляецца больш выгадным супрацоўнікам (паколькі не сядзіць у дэкрэтным і не застаецца дома з хворымі дзецьмі). Жанчыны таксама часта пісалі, што на сумоўях ім задавалі пытанні аб сямейным становішчы: ці замужам, ці ёсць дзеці.

Як аказалася, мужчыны з сямейнымі абавязкамі таксама сутыкаюцца з праблемамі. «Мая начальніца смяялася, калі я паведаміў аб сыходзе ў дэкрэт, і падчас сацыяльнага водпуску пастаянна нагадвала мне пра тое, што мяне чакае работа», — падзяліўся гісторыяй адзін з бацькоў.

СТАР. 4